индивидуум осуществлял бы восприятие, ментальную обработку и оценку окружающей действительности с последующей вербальной реакцией, которая может быть обозначена как **когнитивно-информационная**. Она, как и речевая ситуация, характеризуется: наличием коммуникативной цели; временем и местом действия; говорящим; наличием партнера по общению; предпосылками, из которых исходят говорящие. Отличия же проявляются в сочетании коммуникативных и когнитивных ее сторон; наличии дополнительного компонента в ее структуре (фоновых знаний) с ориентацией на культуру страны изучаемого языка; особой формой организации знаний в виде *фреймов* как глубинных инвариантов определенных их фрагментов.

З.П. Козорог
Белорусский государственный
экономический университет (г. Минск)

ВАЛОДАННЕ ЛІТАРАТУРНАЙ МОВАЙ — ПАКАЗЧЫК АГУЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ ЧАЛАВЕКА

Культурны чалавек — паняцце ўсеабдымнае. Яно ахопвае ўвесь унутраны свет асобы і ўсе яе ўчынкі, яе адносіны да акаляючага асяроддзя, да сябе і да людзей.

Адным з важнейшых элементаў культуры з'яўляецца мова. Гэта неад'емны атрыбут народа, магутны фактар фарміравання нацыянальнай самасвядомасці. Выступаючы галоўным сродкам зносін паміж людзьмі, мова з'яўляецца найбольш яскравай прыкметай, якая адрознівае адзін народ ад другога. Адначасова літаратурная мова, якая мае вусную і пісьмовую разнавіднасці, забяспечвае адзінства народа.

Зносіны паміж людзьмі — гэта складаная дзейнасць двух і больш партнёраў, таму неабходна ўлічваць асабістыя інтарэсы кожнага: і таго, хто гаворыць, і яго субяседніка.

Часцей за ўсё людзі ўступаюць у моўныя зносіны для таго, каб абмяняцца новымі звесткамі, ведамі, калі ў іх ёсць патрэба што-небудзь паведаміць субяседніку, да чаго-небудзь яго заклікаць. Гэта — абмен інфармацыяй, пераважна інтэлектуальнай, лагічнай. Звычайна менавіта гэты працэс называюць камунікацыяй.

Перадача інфармацыі ажыццяўляецца свядома і мэтанакіравана, часта з улікам адрасата (ці адрасатаў), якому перадаецца паведамленне, суадносна з тымі правіламі, якія прыняты ў дадзенай этнакультуры і ў пэўным соцыуме, г.зн. з'яўляюцца канвенцыяльнымі і не наследуюцца, а засвойваюцца ў працэсе накаплення жыццёвага вопыту.

У сучаснай лінгвадыдактыцы прыярытэтным з'яўляецца функцыянальны падыход да навучання мове, які перш за ўсё прадугледжвае развіццё камунікатыўнай кампетэнцыі студэнтаў, г.зн уменняў і навыкаў, якія дазваляюць свабодна карыстацца рознымі сродкамі мовы ў розных сферах адносін з улікам асаблівасцей маўленчай сітуацыі. Свядомае валоданне нормамі літаратурнай мовы ў значнай ступені садзей-

нічае правільнаму выбару адэкватных сродкаў выраження ў працэсе камунікаці, дазваляе вырашыць праблему камунікатыўнай мэтазгоднасці выкарыстання тых ці іншых моўных адзінак у пэўным кантэксце.

Неабходна падкресліць, што камунікацыя паміж людзьмі ўвогуле і моўная камунікацыя ў прыватнасці падпарадкоўваюцца тым канвенцыям (умоўнасцям), якія прыняты ў пэйнай этнічнай культуры ці ў пэўным сацыяльным калектыве ў пэўную гістарычную эпоху. Адсюль вынікае, што аднаго ведання сістэмы той ці іншай мовы, яе фаналагічных, граматычных і лексічных правіл недастаткова для таго каб добра размаўляць на гэтай мове. Для паспяховых моўных зносін неабходны грунтоўныя веды з галіны этналінгвістыкі і соцыалінгвістыкі. Іншымі словамі, ад чалавека, які жадае паспяхова кантактаваць з носьбітамі той ці іншай мовы, патрабуецца ўменне ўжывацца ў мэнталітэт пэўнага народа.

Мова не проста замкнутая ў сабе сістэма знакаў. Гэта сістэма правіл камунікатыўных паводзін чалавека ва ўмовах пэўнай культуры і соцыума.

Калі мець на ўвазе мову як своеасаблівы, а імена камунікатыўны і — больш вузка — вербальны спосаб чалавечых паводзін, то патрэбна ўлічваць выключную здольнасць кожнай канкрэтнай мовы прыстасоўвацца да разнастайных жыццёвых сітуацый. У сувязі з гэтым так цяжка пазнаць сваю мову і непамерна цяжэй пазнаць мову чужую. З улікам усяго сказанага вышэй зразумела, чаму ўзнік выраз «Мова бясконцая, і вывучыць яе немагчыма».

Сацыяльны заказ сучаснага грамадства — навучыць чалавека свабодна валодаць роднай мовай, а таксама замежнымі ва ўсіх сферах іх прымянення. Каб выканаць гэты заказ, патрэбны вялікія намаганні ўсіх тых, хто зацікаўлены ў гэтым.

Е.В. Коршук
Белорусский государственный университет (г. Минск)

АНАЛИЗ СОБСТВЕННОЙ КУЛЬТУРЫ КАК ОСНОВНОЙ КОМПОНЕНТ ФОРМИРОВАНИЯ МЕЖКУЛЬТУРНОЙ КОММУНИКАТИВНОЙ КОМПЕТЕНЦИИ

1. Со значительной задержкой, спустя почти 10 лет после введения специальности «Межкультурная коммуникация» в Москве и несколько десятилетий — в мире, в Беларуси наконец появились такие спецкурсы и специализация.

2. Без понимания собственной культуры, восприятия ее специфических черт, свойственных ей коммуникативных моделей невозможно формирование межкультурной коммуникативной компетенции, т.е. умения эффективно и адекватно общаться в условиях межкультурного общения.

3. Одной из задач курсов межкультурной коммуникации является формирование знаний о собственной культуре обучаемых. Для Беларуси задача эта осложняется небольшим количеством информации по проблеме. Можно назвать очень малое количество авторов, пишущих о белорус-

Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт. Бібліятэка.
Белорусский государственный экономический университет. Библиотека.
Belarus State Economic University. Library.
http://www.bseu.by